**20.** Вызначце з прыведзеных сінонімы да слова ***дрыгва***:

*1) багна; 2) твань; 3) пустыня.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**21.** Як перакладаецца на беларускую мову рускае слова ***резвый***?

**А)** паважны. **Б)** плаксівы. **В)** памяркоўны.
**Г)** разумны. **Д)** жвавы.

**22.** Калі правільна размясціць словы *1) гама, 2) вежа, 3) звон, 4) бінт*, то ў выдзеленых клетках па дыяганалі злева направа зверху ўніз можна прачытаць слова, якога не хапае ў народнай прыказцы:

*Вішня не апала – … не настала.*



Выберыце правільны варыянт.

**А)** 1, 2, 3, 4. **Б)** 4, 3, 2, 1. **В)** 2, 1, 4, 3. **Г)** 4, 2, 3, 1. **Д)** 3, 4, 1, 2.

**23.** Пра якую птушку гаворыцца ў вершы Міхася Пазнякова?

*Уважлівы лекар,*
*Руплівец лясны,*
*Хутчэй прыляцеў ён*
*Да хворай сасны.*

*Прастукаўшы дрэва,*
*Хваробу прагнаў:*
*Расці прыгажуняй*
*Высокай, сасна.*

Складзіце слова-адказ з прапанаваных літар: 1) д, 2) я, 3) з, 4) л, 5) е, 6) ц.

**А)** 3, 1, 4, 5, 2, 6. **Б)** 2, 4, 5, 3, 6, 1. **В)** 1, 3, 2, 6, 5, 4.
**Г)** 1, 2, 6, 5, 4, 3. **Д)** 6, 2, 1, 3, 5, 4.

**24.** Якая народная казка пачынаецца словамі: *«Жыў некалі адзін пан, ды такі злосны, што проста бяда: ніхто не мог яму дагадзіць …»*?

**А)** «З рога ўсяго многа». **Б)** «Сцізорык зламаўся».
**В)** «Ад крадзенага не пасыцееш». **Г)** «Залаты збан».
**Д)** «Разумная дачка».

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ10. Тыраж 28400 экз. г. Мінск. 2011 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2011»

*Чацвер, 17 лютага 2011 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Якога слова не хапае ў вершаваных радках Авер'яна Дзеружынскага:

*Падасінавік чырвоны,*
*Аж свеціцца твар ягоны.*
*І сястра яго …*
*Лашчыць гнуткаю галінкай.*

**А)** асінка. **Б)** ялінка. **В)** вярбінка. **Г)** таполька. **Д)** сасонка.

**2.** Колькі дзеючых асоб садзяць і паліваюць дрэўцы ў вершы Міхася Пазнякова «Садзім алею»?

*Мы ў вясновую нядзелю*
*Садзім новую алею.*
*Садзім тут, уздоўж дарогі, –*
*У гонар свята Перамогі.*

*Таня – ліпку,*
*Клім – дубок,*
*Ясь – каштанік,*
*Я – клянок.*

*А Святлана і Наташа*
*Паліваюць дрэўцы нашы.*
*Хай расце і зелянее*
*Наша слаўная алея!*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**3.** Якія літары патрэбна ўставіць замест кропак у словах сказа:

*Маленькая кроп..лька стала в..сёлаю д..жджынкай.*

**А)** і, і, а. **Б)** я, е, а. **В)** е, я, а. **Г)** е, я, о. **Д)** і, е, а.

**4.** Падлічыце колькасць слоў у скорагаворцы:

*Вадавозвёзвадуадводаправода.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**5.** Якое слова лішняе ў радку: *студзень, люты, зіма, сакавік, снежань?*

**А)** студзень. **Б)** люты. **В)** зіма. **Г)** сакавік. **Д)** снежань.

**6.** *Нізка з каралавых або іншых каштоўных камянёў* называецца … .

**А)** каснічок. **Б)** завушніцы. **В)** каралі.
**Г)** пярсцёнак. **Д)** ланцужок.

**7.** Словы *лес, рэчка, дрэвы, надвор'е* з'яўляюцца … .

**А)** назоўнікамі. **Б)** прыметнікамі. **В)** дзеясловамі.
**Г)** прыслоўямі. **Д)** займеннікамі.

**8.** Выберыце з прыведзеных прыкладаў толькі сказы:

*1) свае веды; 2) любімы горад; 3) мара здзейснілася;*
*4) вясёлы жарт; 5) гучыць песня; 6) адліжны снег.*

**А)** няма сказаў. **Б)** усе прыклады з'яўляюцца сказамі.
**В)** 1, 2, 4. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 6.

**9.** Вызначце з дадзеных словы з аднолькавай колькасцю складоў:

*1) ранак; 2) вучань; 3) паядынак; 4) ведаць; 5) дзяўчынка.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 5.

**10.** Прадоўжыце прыказку: *На хаценне … .*

**А)** ёсць цярпенне. **Б)** нехаценне. **В)** ёсць імгненне.
**Г)** ёсць магчымасць. **Д)** ёсць жаданне.

**11.** Якая літара ў беларускім алфавіце не абазначае гука?

**А)** няма такой літары. **Б)** ў. **В)** й. **Г)** ь. **Д)** ы.

**12.** Вучань запісаў сказ: *Сябр звернуўся да мяне с прозьбай.* Колькі арфаграфічных памылак зрабіў хлопчык?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** памылак няма.

**13.** Які гук часцей за ўсё вымаўляецца ў вершаваных радках Веры Вярбы?

*Восень, мая чарадзейка,*
*Ходзіць па лесе, пяе,*
*І залатая жалейка*
*Песні разносіць яе.*

**А)** [а]. **Б)** [о]. **В)** [э]. **Г)** [п]. **Д)** [р].

**14.** Вызначце правільна запісаныя ў алфавітным парадку назвы беларускіх рэк.

**А)** Буг, Дзвіна, Дзісна, Піна, Нёман, Шчара.
**Б)** Буг, Дзвіна, Дзісна, Нёман, Шчара, Піна.
**В)** Дзвіна, Дзісна, Буг, Нёман, Піна, Шчара.
**Г)** Буг, Дзвіна, Дзісна, Нёман, Піна, Шчара.
**Д)** Буг, Дзісна, Дзвіна, Піна, Шчара, Нёман.

**15.** Дадзены сказы:

*1) Паволі насоўваўся вячэрні змрок.*
*2) Адценні зялёнага колеру ўжо немагчыма было адрозніць.*
*3) Надыходзіў летні вечар.*
*4) Зелень на дрэвах цямнела.*

Вызначце правільны парадак сказаў, каб атрымаўся тэкст.

**А)** 1, 3, 2, 4. **Б)** 2, 1, 3, 4. **В)** 3, 2, 1, 4. **Г)** 4, 3, 1, 2. **Д)** 3, 1, 4, 2.

**16.** Вызначце з прыведзеных словы, у якіх націск падае на корань:

*1) завязь; 2) загадка; 3) сеялка;*
*4) сняжынка; 5) талерка; 6) баравік.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 4, 6. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 5, 6.

**17.** Дадзены сказы:

*1) Калі ласка, перадай родным прывітанне.*
*2) Хлопчык хутка падрыхтаваў заданне.*
*3) Які ваш любімы занятак у вольны час?*
*4) Колькі неразгаданага хараства тоіцца ў прыродзе!*

Вызначце пабуджальны сказ.

**А)** няма пабуджальнага сказа. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**18.** Згубіліся словы ў сказах:

*1) Мы слухаем і чуем … . 2) Мы глядзім і бачым … .*
*3) Мы ходзім … . 4) Мы працуем … .*

Дапамажыце словам *а) вачамі, б) рукамі, в) вушамі, г) нагамі* вярнуцца на свае месцы.

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-г, 3-в, 4-а. **В)** 1-г, 2-а, 3-б, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б. **Д)** 1-а, 2-в, 3-б, 4-г.

**19.** Якая паслядоўнасць галосных літар у беларускім алфавіце?

**А)** а, о, е, ё, і, у, ы, э, ю, я. **Б)** а, е, ё, і, о, у, ы, э, ю, я.
**В)** е, ё, і, о, а, у, ю, ы, э, я. **Г)** а, я, э, е, о, ё, у, ю, ы, і.
**Д)** а, е, ё, і, у, о, ы, э, ю, я.